# Выпушчаны ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які сёння, 20 верасня, выкарыстоўваецца для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прысвечанага 75-годдзю Гродзенскай вобласці

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 20 верасня 2019 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прысвечанага 75-годдзю Гродзенскай вобласці.

Месца гашэння – аддзяленне паштовай сувязі № 25 Гродна.

Колер масцікі – чорны.

Гродзенская вобласць – адна з шасці абласцей Беларусі. Размешчана на захадзе краіны, мяжуе з Польшчай і Літвой. Адміністрацыйны цэнтр – горад Гродна.

Гродзенская вобласць мае развітую дарожную інфраструктуру. Праз яе праходзяць міжнародныя аўтамагістралі, якія злучаюць краіны Еўропы і СНД. Мае таксама шырокую чыгуначную сетку.

Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А».

Дызайн спецштэмпеля і канверта Алены Мядзведзь.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/20-09-2019-5288*